*ЛІТШКОЛА*

# *ТАМ, ЗА АПОШНЯЙ СТАРОНКАЙ*



**23 кастрычніка пасяджэнне Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы атрымалася нешматлюдным. Яно было прысвечана вывучэнню такога элемента кампазіцыі літаратурнага твора, як эпілог.**

Так, колькасць слухачоў на кастрычніцкай сустрэчы была невялікай. Але можна з упэўненасцю сказаць, што той дзясятак чалавек, якія, адклаўшы свае важныя справы, прыйшлі пагутарыць на літаратурныя тэмы, даказалі невыпадковасць сваёй прысутнасці на чароўнай тэрыторыі мастацтва.

На працягу гадзіны з нечым мы паспелі пазнаёміцца з вызначэннем паняцця «эпілог», а таксама з прыродай эпілогаў, іх функцыямі і тыпамі. А вылучаюць літаратуразнаўцы такія тыпы эпілогу, як апавядальны, пераходны, эпілог сну, парадыйны эпілог і водгук. Таксама літаратуразнаўцы дзеляць эпілогі на тыя, якія маюць на ўвазе закрыты або адкрыты фінал. Прапанавала наша літшкола і свой варыянт эпілогу.

Аматары літаратуры, якія наведалі кастрычніцкі занятак, падзяліліся ўласным разуменнем паняцця эпілог, пашукалі яго прыклады, паўдзельнічалі ў культуралагічнай і філасофскай дыскусіі на тэмы эпілогу ў літаратуры і не толькі. Калі метафарычна прыняць жыццё чалавека за сюжэт літаратурнага твора, якім бачацца варыянты магчымага эпілогу? Што адбываецца, калі перавернутая апошняя старонка?.. Зразумела, адказы на такія няпростыя пытанні шукаць лепш разам. І яны прагучалі, цікавыя, глыбокія, неадназначныя. …Паэтэса-аматар Ірына Полудзень у чарговы раз падарыла лірычнае прысвячэнне тэме занятку. Істотным плюсам мерапрыемства стаў удзел зацікаўленай моладзі – старшакласніц гродзенскай СШ № 39 імя І. Д. Лебедзева Маргарыты Хацяноўскай і Паліны Борыс. Таксама працягвае цікавіцца нашым жыццём гарадское літаб’яднанне «Надзея». А колькасць членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі гэтым разам «вырасла» да трох (да нас нечакана далучылася лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь, дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая).

Амаль палова занятку была адведзена на абмеркаванне наступных тэм і прадметаў вывучэння. Нягледзячы на зніжэнне колькасці зацікаўленых у працы нашай літшколы, Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі мае намер працягваць работу грамадска-адукацыйнага праекта.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**



**На фота**: «Кампазіцыя твора. Эпілог» – на такую тэму створаная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі грамадская літаратурная школа правяла кастрычніцкі занятак у офісе СПБ-Гродна. 23 кастрычніка 2024 года.





Дзмітрый Радзівончык,
Анатоль Апанасевіч,
Ганна Скаржынская-Савіцкая
(СПБ)









Паліна Борыс і Маргарыта Хацяноўская






ПАДЗЯКА
Диплом




Аматар літаратуры Ларыса Панфілава







Паэтэса Таццяна Лугавая

Паэтэса, празаік Кацярына Калік





Ірына Полудзень
Галіна Садоўская





**Фота** Анатоля Апанасевіча і Дзмітрыя Радзівончыка